71.4(4Бел)
С 928
Д 100
+3

Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"

УДК 008(476)

**Сцепанцоў**
**Аляксандр Іванавіч**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# БЕСПЕРАПЫННАЯ АДУКАЦЫЯ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ У СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ
**(на матэрыяле Рэспублікі Беларусь)**

Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата культуралогіі
па спецыяльнасці 24.00.01 – тэорыя і гісторыя культуры

Мінск 2009

Работа выканана на кафедры культуралогіі УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"

| | |
|---|---|
| Навуковы кіраўнік – | **Ігнатовіч Пётр Рыгоравіч,** кандыдат гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры культуралогіі УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў" |
| Афіцыйныя апаненты – | **Бабосаў Яўген Міхайлавіч,** доктар філасофскіх навук, прафесар, акадэмік НАН Беларусі, загадчык аддзела палітычнай сацыялогіі і інфармацыйных тэхналогій ДНУ "Інстытут сацыялогіі НАН Беларусі"<br>**Каспярук Аляксандр Анатольевіч,** кандыдат культуралогіі, дацэнт, рэктар ПУА "Інстытут парламентарызму і прадпрымальніцтва" |
| Апаніруючая арганізацыя – | УА "Беларускі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт" |

Абарона адбудзецца 28 студзеня 2010 г. а 16.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 09.03.01 ва УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў" па адрасе: 220001, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17, e-mail: buk@buk.by; тэл. вучонага сакратара 222-83-36.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў".

Аўтарэферат разасланы 16 снежня 2009 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый Д 09.03.01
кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт І.А.Смірнова

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## КАРОТКІЯ ЎВОДЗІНЫ

У сістэме дзяржаўнай сацыяльна-эканамічнай палітыкі культура з'яўляецца важнейшым фактарам фарміравання і ўдасканалення "чалавечага капіталу", прызначанага садзейнічаць устойліваму сацыяльна-эканамічнаму развіццю краіны, стварэнню новай сістэмы маральна-духоўных і сацыяльна-этычных каштоўнасцей грамадства. Дзяржава гарантуе палітычныя і эканамічныя ўмовы падтрымкі сацыякультурных інстытутаў, найважнейшым з іх з'яўляецца адукацыя, якая спрые фарміраванню светапогляду чалавека і ўстановак грамадства; забяспечвае вывучэнне, засваенне і ўзнаўленне сістэмнай сукупнасці духоўных і матэрыяльных каштоўнасцей, назапашаных чалавецтвам; рыхтуе кваліфікаваных спецыялістаў для падтрымкі функцыянавання ўстаноў культуры і іх руху наперад. Глабалізацыя і рэвалюцыя ў інфармацыйнай і камунікацыйнай тэхналогіях вызначылі неабходнасць у новай парадыгме развіцця грамадства, у цэнтры якой чалавек. Большасць людзей падзяляе погляды на мэты адукацыі як на падрыхтоўку маладых людзей да жыцця, развіццё іх здольнасцей і талентаў, стварэнне магчымасцей для раскрыцця іх патэнцыялу, станаўлення паўнапраўнымі членамі дэмакратычнага грамадства. На гэтыя задачы павінна быць скіравана ўся адукацыйная сістэма ад агульнаадукацыйнай школы (інтэлектуальнае і эстэтычнае развіццё, камп'ютэрная граматнасць) праз сярэднія спецыяльныя і вышэйшыя ўстановы (набыццё кваліфікацыі, умення вучыцца ў розных умовах) да паслядыпломнай адукацыі (павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка, спецыялізацыя, засваенне наваўвядзенняў). Прафесійная адукацыя разглядаецца як цэласны і вырашальны кампанент навучання на працягу ўсяго жыцця. Сістэма адукацыі, якая існуе ў галіне культуры, уплывае на духоўнае жыццё грамадства: культурныя нормы і каштоўнасці, стэрэатыпы культурных дзеянняў трансліруюцца ад пакалення да пакалення і надаюць пэўную стабільнасць у развіцці. Вывучэнне сістэмы прафесійнай адукацыі мае ключавое значэнне пры распрацоўцы метадаў арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці, умоў для культурных зносін, арганізацыі эстэтычнага выхавання моладзі, творчага станаўлення спецыялістаў культуры, спрые пастаяннаму паглыбленню іх кампетэнтнасці і прафесіяналізму. Праведзенае даследаванне выяўляе *праблему* арганізацыйна-кіраўнічых магчымасцей сістэмы прафесійнай адукацыі па ўзнаўленні і бесперапынным удасканаленні спецыялістаў сферы культуры, фарміраванні іх гатоўнасці да самастойнай практычнай работы па ўсёй тыпалагічнай разнастайнасці ўстаноў культуры, што і абумовіла *актуальнасць* дысертацыі.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі**

Даследаванне выконвалася ў рамках задання "Распрацаваць прагноз кадравага забеспячэння сферы культуры (2001–2005 гг.)" галіновай навукова-тэхнічнай праграмы "Культура", з'яўляецца часткай комплекснай навукова-даследчай тэмы "Канцэптуальна-тэарэтычныя і тэхналагічныя асновы арт-менеджменту" (зацверджана на пасяджэнні савета БДУ культуры і мастацтва 20.03.06 г., пратакол № 7) кафедры менеджменту сацыякультурнай дзейнасці УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў". Даследаванне адпавядае галіновай праграме "Захаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь на перыяд 2006–2010 гг.", у якой для сферы кадравага патэнцыялу

БІБЛІЯТЭКА
Беларускага ... універсітэта культуры і мастацтваў

культуры пастаўлена мэта – “захаванне і развіццё нацыянальных мастацкіх школ, удасканаленне сістэмы мастацкай адукацыі, павышэнне якаснага ўзроўню кадраў”.

**Мэта і задачы даследавання**

*Мэта* – раскрыць сутнасць бесперапыннай прафесійнай адукацыі спецыялістаў культуры як сістэмы трансляцыі спецыялізаваных ведаў, фарміравання прафесійна-кваліфікацыйнага складу кадраў.

У адпаведнасці з вызначанай мэтай пастаўлены наступныя *задачы*:

– удакладніць паняцце “кадры культуры” і вызначыць прыметы прафесійнай супольнасці сферы культуры;

– вызначыць этапы развіцця сацыякультурнай прафесійнай адукацыі і адначасовага станаўлення кадравай сістэмы культуры краіны;

– ахарактарызаваць дынаміку змяненняў прафесійна-адукацыйнага ўзроўню спецыялістаў культуры як паказчыка іх кампетэнтнасці і прафесіяналізму, гатоўнасці да выканання практычных задач у сферы культуры;

– выявіць змест адукацыйнага комплексу галіны культуры як асновы фарміравання і развіцця галіновай кадравай сістэмы і даць рэкамендацыі па яго ўдасканаленні;

– раскрыць адметныя асаблівасці бесперапыннай прафесійнай адукацыі спецыялістаў культуры, апісаць іх у графааналітычнай мадэлі.

**Аб’ект і прадмет даследавання**

*Аб’ектам* даследавання з’яўляецца сацыякультурная адукацыя як сфера грамадскай практыкі на рубяжы XX і XXI стагоддзяў. *Прадметам* – сістэма падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў культуры ў Рэспубліцы Беларусь. Выбар аб’екта і прадмета даследавання абумоўлены неабходнасцю навуковага асэнсавання развіцця бесперапыннай прафесійнай адукацыі спецыялістаў культуры як сістэмы прафесійнага станаўлення і ўдасканалення спецыялістаў, папаўнення грамадства творчымі кадрамі, здольнымі быць стваральнікамі, інтэрпрэтатарамі і арганізатарамі культуры, актыўна ўплываць на развіццё духоўнага свету асобы.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Кадры культуры – калектыўны суб’ект культурнай дзейнасці, устойлівае сацыяльна-прафесійнае аб'яднанне людзей на функцыянальна-дзейнаснай аснове са спецыялізацыямі паводле профіляў адукацыі “педагогіка”, “мастацтва і дызайн”, “гуманітарныя навукі”, “камунікацыі”. Гэта асноўны склад спецыялістаў, які выражае індывідуальную і калектыўную свядомасць і пазнанне, валодае збіральнай творчай энергіяй і інфармацыйна-творчай магутнасцю для задавальнення грамадскіх патрэбнасцей у аматарскай і прафесійнай творчасці, у забеспячэнні функцыянавання ўстаноў культуры. Кадры культуры характарызуюць: *сацыяльная ідэнтычнасць* (прыналежнасць да прафесійнай групы і яднанне з ёй – вобраз “мы”, узаемазвязанасць і ўзаемазалежнасць індывідаў); *агульнасць мэты* (фарміраваць спрыяльнае сацыякультурнае асяроддзе, садзейнічаць творчай самаарганізацыі людзей), *нормаў* (арыентаваць на нацыянальныя і агульначалавечыя каштоўнасці і забяспечваць іх агульнадаступнасць), *інтарэсаў* (імкнуцца да творчай самаактуалізацыі, да стварэння актуальных культурных формаў); *сумеснасць дзейнасці* (стварэнне, аднаўленне, акумуляванне, захаванне, вывучэнне, папулярызацыя, выкарыстанне і распаўсюджванне культурных каштоўнасцей, задавальненне культурных, адукацыйных, інфармацыйных, навуковых патрэбнасцей людзей; эстэтычнае, патрыятычнае і маральнае выхаванне, арганізацыя вольнага часу



насельніцтва); *культурныя каштоўнасці* (створаныя ці пераўтвораныя матэрыяльныя прадметы і нематэрыяльныя праявы культуратворчасці, якія маюць эстэтычны змест і сэнс).

2. У гістарычнай рэтраспектыве краіны можна вылучыць некалькі этапаў развіцця сацыякультурнай прафесійнай адукацыі і станаўлення кадравай сістэмы сферы культуры. 1918–1941 гг. – стварэнне разгалінаванай сеткі ўстаноў культуры, арганізацыя культурна-асветніцкай работы (палітыка-выхаваўчай накіраванасці), фарміраванне адпаведнай структуры культурных інстытутаў, у тым ліку прафесійна-адукацыйных; развіццё кадравай складаючай. 1944–1975 гг. – інтэнсіўнае адраджэнне і ўдасканаленне культурна-асветніцкай сістэмы, разгортванне прафесійнага мастацтва, развіццё адукацыйнай падсістэмы культуры – крыніцы папаўнення кадравых рэсурсаў. 1976–1990 гг. – трансфармацыя культурна-асветніцкай работы ў сістэму сацыякультурнай дзейнасці, узмацненне цэнтраімклівых тэндэнцый аб’яднання ў прафесійныя кадравыя супольнасці культуры, інтэграцыя ўзаемазвязаных узроўняў адукацыі ў адзіную сістэму бесперапыннай прафесійнай адукацыі як кадравай асновы культурнай дзейнасці. 1991–2009 гг. – устанаўленне цэласнай кадравай сістэмы галіны культуры як сукупнасці ўзаемазалежных складаючых: прафесійнай культуратворчай дзейнасці індывідуальных і калектыўных суб’ектаў, бесперапыннай прафесійнай адукацыі ў галіне культуры, кіраўніцкай арганізацыйна-каардынуючай падсістэмы.

3. Статыстыка фіксіруе дынаміку прыросту колькасці спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у суадносінах да агульнай колькасці працуючых ва ўстановах культуры, выпуск спецыялістаў таксама дае паступовы нарастаючы вынік, што сведчыць аб якасным прырастанні кадравага патэнцыялу сферы культуры і аб узроўні эфектыўнасці сістэмы падрыхтоўкі (вытворчасці) кадраў*. Неабходнасць высокага прафесійна-адукацыйнага ўзроўню спецыялістаў галіны выклікана скіраванасцю практычнай дзейнасці на ўзнаўленне змястоўнага культурнага асяроддзя, арганізацыю аматарскай творчасці насельніцтва, развіццё духоўнага свету асобы. Адукацыйная сістэма культуры цалкам ахапляе патрэбнасны (спажывецкі) сегмент сферы культурна-адукацыйных паслуг і здольная задавальняць попыт устаноў культуры на спецыялістаў усёй наменклатуры спецыяльнасцей культуры. Вывучэнне дынамікі папаўнення ўстаноў культуры маладымі спецыялістамі выяўляе *праблему* ўстойлівага захавання вакансій пасад спецыялістаў і запаўнення іх работнікамі без прафесійнай адукацыі. Прыток маладых спецыялістаў не вырашае праблемы цякучасці кадраў, асабліва ў сельскай мясцовасці, што сведчыць аб незавершанасці сістэмы сацыяльнай абароны выпускнікоў, адсутнасці дзяржаўных гарантый іх замацавання і недастатковай сацыяльнай прэстыжнасці працы работніка культуры.

4. Адным з найбольш значных сродкаў сацыяльнага ўзнаўлення грамадства, павышэння яго інтэлектуальна-творчага патэнцыялу і перспектыў культурнага развіцця з'яўляецца прафесійная адукацыя ў сферы культуры як важнейшая сістэма замацавання сацыяльна-культурных каштоўнасных арыенціраў і прыярытэтаў, забеспячэння працэсу сацыялізацыі, інкультурацыі індывіда і авалодання “культурнай кампетэнтнасцю”, падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў культуры для выканання і развіцця неабходных відаў

---

* Дынаміка прыросту колькасці спецыялістаў у адносінах да агульнай колькасці працуючых ва ўстановах культуры: 1991 г. – 62%, у тым ліку з вышэйшай адукацыяй 21%, 2008 г. – 88,7% (+26,7%), з вышэйшай адукацыяй – 43,6% (+22,6%); дынаміка выпуску спецыялістаў: 1991 г. – 2185, з вышэйшай адукацыяй – 983 чалавекі, 2008 г. – 3012 чалавек (+37,8%), з вышэйшай адукацыяй – 1223 чалавекі (+24%).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурнай дзейнасці. Сістэма ўтрымлівае шырокі пералік мастацка-творчага, навукова-метадычнага, арганізацыйна-кіраўніцкага напрамкаў дзейнасці. Такая дыферэнцыяцыя з'яўляецца праявай усеагульнай тэндэнцыі паглыблення і дэталёвага засваення прафесійных тэхналогій. Спецыялізацыя дае перавагі ў якасным набыцці і развіцці прафесійных навыкаў, але спараджае праблему цэласнага ўспрымання аб'екта дзейнасці, упісвання ў сістэму яго ўзаемасувязей і ўзаемазалежнасцей. Становіцца неабходнай актывізацыя прафесійных зносін як унутрыгаліновых, так і міжгаліновых, міждзяржаўных. Стварэнне асацыяцыі навучальных устаноў культуры кансалідуе навукова-педагагічныя творчыя сілы; аптымізуе арганізацыйна-кіраўнічыя сувязі спецыялізаваных прафесійных кірункаў; спрыяе абмену ідэямі, ведамі і вопытам сярод членаў асацыяцыі і за яе межамі; павысіць устойлівасць адукацыйных і культуратворчых сувязей у сістэме "школа – ССНУ – ВНУ".

5. Бесперапынная прафесійная адукацыя спецыялістаў культуры – працэс набыцця і паглыблення сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці ў сістэме навучальных устаноў культуры і сацыякультурнай практыкі, яе вызначаюць адметныя асаблівасці: *пабудаванасць усёй сістэмы навучання на эмацыянальна-псіхалагічным асваенні свету і развіцці творчых задаткаў асобы*; *неабходнасць ранняга прафесійнага адбору моладзі на падставе выяўлення іх прыродных здольнасцей і забяспячэнне бесперапыннай паслядоўнасці прырашчэння прафесіяналізму*; *развіццё здольнасцей асэнсавання заканамернасцей культуратворчасці*; *набыццё арганізацыйных уменняў у рэалізацыі духоўна-эўрыстычных, інтэлектуальных, мастацка-творчых патэнцый людзей, праяўленняў іх сацыяльна-культурнай актыўнасці*. Працэс навучання і фарміравання спецыялістаў разгортваецца ў лагічнай паслядоўнасці па *узроўнях* ускладнення адукацыйнай і творчай дзейнасці. Першы (пачатковы), *прафесійна-арыентацыйны*, – фарміраванне эстэтычных каштоўнасных арыентацый і вобразнага мыслення, набыццё зыходных прафесійных навыкаў і далучэнне да культуратворчасці; другі, *прафесійны сярэдні*, – развіццё і замацаванне аналітычна-канструктыўных, вобразна-прасторавых, вербальна-прапазіцыянальных якасцей інтэлекта; праяўленне творчай фантазіі, мастацкіх эмоцый; самавызначэнне ў прафесіі, увядзенне ў розныя віды культурнай практыкі; трэці, *прафесійны вышэйшы*, – атрыманне навыкаў прадукцыйнай дзейнасці ў абранай сферы культуры, засваенне фундаментальных і прыкладных ведаў і ўменняў па функцыях і тэхналогіях культурнай дзейнасці; чацвёрты, *майстэрства і самасцвярджэння*, – стварэнне, інтэрпрэтацыя, прапаганда культурных каштоўнасцей, навуковае і творчае асэнсаванне культурнай дзейнасці, арганізацыйна-праектная работа, здабыванне сацыяльнай і прафесійнай сталасці. Для ўяўлення адукацыйнай рэальнасці прапануецца графааналітычная мадэль бесперапыннай прафесійнай адукацыі спецыялістаў культуры, якая мае славесна-лагічную прыроду, змяшчае характарыстыкі аб'екта-арыгінала. Мадэль заснавана на *прынцыпах* пераемнасці ўзроўняў адукацыі; кампетэнтнаснай арыентацыі ў атрыманні вынікаў адукацыі; міждысцыплінарнасці зместу адукацыі; узаемадапаўнення тэхналагічных прыёмаў і эстэтычнага ўспрымання, творчай фантазіі.

**Асабісты ўклад суіскальніка**

Дысертацыя з'яўляецца вынікам асабістых навуковых даследаванняў з выкарыстаннем матэрыялаў і дакументаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, архіваў Савета Міністраў і Міністэрства культуры, статыстычных даных Міністэрства статыстыкі, навуковых і перыядычных выданняў. Гэта першае комплекснае даследаванне



бесперапыннай прафесійнай адукацыі спецыялістаў у сферы культуры.

У выніку даследавання:

– удакладнены змест паняцця "кадры культуры", вызначаны прыметы прафесійнай супольнасці;

– прапанавана гістарычная перыядызацыя развіцця сацыякультурнай прафесійнай адукацыі, станаўлення кадравай сістэмы культуры;

– выяўлена дынаміка кадравага складу, яго сутнасная прафесійна-адукацыйная аснова ў розных тыпах арганізацый культуры;

– адукацыйны комплекс галіны культуры паказаны як цэласная шматузроўневая сістэма, прапанаваны магчымы кірунак умацавання творчых і навукова-метадычных рэсурсаў адукацыі ў сферы культуры;

– вызначаны адметныя ўласцівасці бесперапыннай прафесійнай адукацыі ў сферы культуры, прапанавана яе тэарэтычная мадэль, якая адлюстроўвае мэтанакіраванасць і паслядоўнасць разгортвання адукацыйнага працэсу ў адпаведнасці з узроўнямі ўскладнення адукацыйнай і культуратворчай дзейнасці.

Вынікі дысертацыйнага даследавання пашыраюць праблемнае поле вывучэння кадраў культуры як асноўнай састаўляючай рэсурснай базы сацыякультурнай дзейнасці насельніцтва, сведчаць аб змястоўнай сувязі прафесійна-адукацыйнага ўзроўню спецыялістаў культуры і вытворчасці культурных даброт, прадуктаў і паслуг.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Высновы даследавання на розных яго этапах былі апрабіраваны на Міжнародным семінары "Трансрегиональные и интернациональные аспекты культурной политики" (Мінск, 1998); Міжнароднай навуковай канферэнцыі БелДІПК "Чалавек. Культура. Рынак" (Мінск, 2000); XII Міжнародных Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытаннях (Мінск, 2006); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Культура. Наука. Творчество" (Мінск, 2007); Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе" (Гродна, 2007); Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Культура Беларусі і сусвет: агульнае і асаблівае" (Мінск, 2008); Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Культура. Наука. Творчество" (Мінск, 2009); XV Міжнародных Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытаннях (Мінск, 2009); рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі "Дзяржава і творчая асоба: роля творчай інтэлігенцыі ў фарміраванні ідэалогіі беларускай дзяржавы" (Мінск, 2004); рэспубліканскай навуковай канферэнцыі "Сучасны гісторыка-культурны працэс: самавызначэнне і самарэалізацыя суб'екта" (Мінск, 2006); навукова-практычнай канферэнцыі "Личность ребенка: развитие творческих способностей и формирование культуры мира" (Нарач, 1998); навуковай канферэнцыі "Культуралагічная падрыхтоўка студэнтаў у сістэме ВНУ" (Мінск, 1998); навукова-метадычнай канферэнцыі "Стандарты вышэйшай культуралагічнай і мастацкай адукацыі: тэарэтыка-метадалагічныя аспекты" (Мінск, 1999); навукова-практычнай канферэнцыі БелДІПК "Чалавек. Культура. Інфарматыка" (Мінск, 1999); навукова-метадычнай канферэнцыі "Практыка як састаўная частка прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў для сацыякультурнай сферы" (Мінск, 2000); навукова-метадычнай канферэнцыі "Шляхі павышэння эфектыўнасці кіруемай самастойнай работы студэнтаў" (Мінск, 2008); навуковай канферэнцыі "Культура ва ўмовах глабалізацыі: тэарэтычныя і метадалагічныя праблемы" (Мінск, 2009) , а таксама на навуковых і навукова-практычных семінарах.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Апублікаванасць вынікаў даследавання**

Асноўныя вынікі па тэме даследавання адлюстраваны ў 23 публікацыях агульным аб'ёмам 8,8 аўт.л., з іх 6 артыкулаў у рэцэнзаваных навуковых часопісах (2,44 аўт. л.), 6 публікацый у навуковых зборніках, 11 – у зборніках матэрыялаў навукова-практычных канферэнцый.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, дзвюх глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса, дадаткаў. Агульны аб'ём дысертацыі – 151 старонка, з іх 108 старонак – асноўны тэкст, 14 старонак – бібліяграфічны спіс, які ўключае спіс выкарыстаных крыніц (188 найменняў на беларускай, рускай і англійскай мовах) і спіс публікацый суіскальніка (23 наймення на беларускай і рускай мовах). 29 старонак займаюць дадаткі.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

Ва **ўводзінах і агульнай характарыстыцы работы** абгрунтоўваецца выбар тэмы даследавання, яе актуальнасць, вызначаецца мэта, задачы, аб'ект і прадмет даследавання; фармулююцца палажэнні, якія выносяцца на абарону; раскрываецца асабісты ўклад суіскальніка, апрабацыя вынікаў дысертацыі і ступень іх апублікаванасці, структура і аб'ём дысертацыі.

**У першай главе "Станаўленне кадравай сістэмы культуры"** даецца тэарэтычны аналіз праблемы; раскрываецца сістэма ўдасканалення кадравага складу арганізацый культуры.

У раздзеле **1.1 "Гістарыяграфія праблемы і характарыстыка крыніц"** выяўляюцца і сістэматызуюцца навуковыя крыніцы, звязаныя з даследаваннямі прафесійнай дзейнасці чалавека. Самая старажытная класіфікацыя напрамкаў дзейнасці людзей пры разглядзе структуры грамадства была дадзена ў Антычнасці Платонам, які падзяліў грамадзян на тры асноўныя грамадскія класы, ці разрады: работнікаў, абаронцаў, філосафаў. Гістарычныя паралелі выяўляюцца праз шмат стагоддзяў у даследаваннях нямецкіх філосафаў І.Г.Гердэра і Ф.Гегеля. У мінулым стагоддзі П.Сарокін распрацаваў канцэпцыю сацыяльнай і прафесійнай стратыфікацыі, дзе цэнтральнымі паняццямі выступаюць сацыяльная мабільнасць, сацыяльная цыркуляцыя індывідаў і іх размеркаванне ў *прафесійнай арганізацыі* праз механізмы сацыяльнай селекцыі. У сучаснай практыцы гэта пацвярджае сістэма выяўлення, адбору, навучання і размеркавання спецыялістаў культуры. Т.Парсанс у канцэпцыі мадэрнізацыі грамадства важнейшым фактарам вызначыў адукацыйную рэвалюцыю, якая значна ўплывае на структуру занятасці і ў цэлым на структуру ўсяго грамадства, павышае яго адаптацыйную здольнасць праз першынство арганізацыі-асацыяцыі ў яе калегіяльнай форме, што змяншае важнасць рынку і бюракратыі. У сучаснай культуралагічнай літаратуры выяўляецца шырокі дыяпазон навуковых поглядаў на суб'ектаў культуры: вызначаецца асоба як сукупнасць усіх грамадскіх адносін, частка працоўнага калектыву ў межах "малога соцыуму"; як сацыяльнае аб'яднанне індывідаў у сацыякультурную цэласнасць праз сукупнасць сувязей і адносін, сацыяльнае аўтаномнае калектыўнае ўтварэнне; сацыяльна-прафесійныя канстэляцыі; як носьбіт вызначаных нормаў дзейнасці, пазнання і калектыўнай свядомасці, "калектыўных уяўленняў", калектыўнай памяці, калектыўных рашэнняў пазнавальных задач (А.М. Андрэеў, Э.А. Арлова, Г.У. Драч, А.Б. Есін,



У.А. Лектарскі, І.Я. Лявяш, Ю.Н. Салонін, А.Я. Фліер і інш.). Разглядаюцца носьбіты актыўнасці ў стварэнні, засваенні, захаванні, распаўсюджванні і развіцці духоўных і матэрыяльных каштоўнасцей; "абагульнены суб'ект" сацыяльна-культурнай дзейнасці – прафесійная супольнасць шматлікіх асоб – спецыялістаў, навукоўцаў, кіраўнікоў, выхавацеляў; сукупны суб'ект культурнай палітыкі (кадры) – менеджэры, спецыялісты культуры; кампанент духоўнай вытворчасці – кадры спецыялістаў, якія ажыццяўляюць асноўныя функцыі па абнаўленні, новай інтэрпрэтацыі, прывядзенні ў адпаведнасць са зменлівымі ўмовамі быцця створаных каштоўнасцей (М.А.Арыярскі, Б.С.Ерасаў, Т.Р. Кісялёва, Ю.Д. Красільнікаў, В.М. і В.В.Чыжыкавы і інш.). Шэраг даследаванняў прысвечаны распрацоўцы сацыяльна-эканамічных, сацыялагічных і палітычных праблем кадравага менеджменту, аналізу ўзаемаадносін груп і асобы, кіраўнікоў і падначаленых (Я.М.Бабосаў, М.П.Бяляцкі, С.В.Зыгмантовіч, Г.У. Карзенка, Р.Я.Ціханаў, Г.В. Шчокін і інш.). Прапануюцца сучасныя канцэпцыі адукацыі (А.Р.Асмолаў, Б.С.Гершунскі, А.І.Жук, Н.М.Кашэль, Ю.Э.Красноў, А.М.Новікаў і інш.), у навуковых крыніцах разглядаецца праблематыка падрыхтоўкі кадраў у нашай краіне, раскрываецца значэнне культуралагічнай адукацыі ў фарміраванні асобы маладога чалавека (Я.Д.Грыгаровіч, П.Р.Ігнатовіч, М.М.Каралёў, Л.М. Рагачова, А.І.Смолік і інш.). Вызначаецца сацыяльна-эстэтычны, вартасны сэнс мастацкай адукацыі як фактару станаўлення духоўнай культуры Беларусі (В.У.Пазнякоў, В.П.Пракапцова, Л.Е.Раманенка, В.А.Салееў, У.П.Скараходаў, В.Л.Яканюк і інш.). Названымі даследчыкамі не закраналіся пытанні вызначэння гістарычнай перыядызацыі развіцця прафесійнай адукацыі ў сферы культуры нашай краіны; выяўлення дынамікі ўдасканалення кадравага складу ў розных тыпах арганізацый культуры; адсутнічала дэфініцыя "кадры культуры", не разглядаліся ўзроўні бесперапыннай прафесійнай адукацыі спецыялістах у сферы культуры, яе каштоўнасныя арыенціры. Гэтыя пытанні склалі аснову для нашага даследавання.

У раздзеле **1.2 "Метадалагічная база даследавання і экспплікацыя асноўных паняццяў"** для вызначэння шляхоў развіцця сацыякультурнай прафесійнай адукацыі і адначасовага станаўлення кадравай сістэмы культуры ў канкрэтна-гістарычных умовах выкарыстаны *ўніверсальны прынцып гістарызму*; прыменены *сістэмны і структурна-функцыянальны навуковыя падыходы* для разгляду цэласнай якаснай акрэсленасці бесперапыннай прафесійнай адукацыі ў галіне культуры як часткі сацыякультурнай адукацыі; выкарыстаны *метад статыстычнага аналізу*, які дазволіў праз дынаміку лічбаў устанавіць станоўчы рух прырашчэння кадравага патэнцыялу практычна па ўсіх напрамках культурнай дзейнасці; *параўнальны аналіз* забяспечыў выяўленне будовы даследуемага аб'екта праз выяўленне падабенства і розніцы паміж структурнымі элементамі (падсістэмамі) агульнага аб'екта даследавання; ажыццёўлена *тэарэтычнае мадэліраванне*, у аснове якога – абагульненне і метад аналогій, адлюстраванне аб'екта даследавання для яго спазнання і разумення, здольнае замяшчаць яго ў мадэлі і даваць праз яе новую інфармацыю, ствараць "рэпрэзентацыйны артэфакт", служыць сродкам усведамлення дзейнасці, злучэння са светам. Для забеспячэння логікі даследавання пададзены асноўныя культуралагічныя паняцці і тэрміны прафесійнай прыналежнасці. У навуковых публікацыях не распрацавана паняцце "кадры культуры", дысертант прапануе дэфініцыю, у якой кадры культуры вызначаюцца як калектыўны суб'ект культурнай дзейнасці, устойлівае сацыяльна-прафесійнае аб'яднанне людзей на функцыянальна-дзейнаснай аснове са спецыялізацыямі паводле профіляў адукацыі "педагогіка",



РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

"мастацтва і дызайн", "гуманітарныя навукі", "камунікацыі" (на падставе Агульнадзяржаўнага класіфікатара Рэспублікі Беларусь "Спецыяльнасці і кваліфікацыі"). Кадры культуры выступаюць як сацыяльны *сукупны* суб'ект, структураваны ў выглядзе са-суб'ектаў, паміж якімі ўсталёўваюцца міжсуб'ектныя адносіны – важная ўмова культурнага працэсу. Аб'ектывіраванне адбываецца ў разнастайных формах культурнай практыкі. Спецыялісты культуры здзяйсняюць вытворчасць каштоўнасцей культуры, іх распаўсюджванне, тыражаванне і захаванне, вытворчасць паслуг па спажыванні і засваенні прадукцыі культурнай дзейнасці, а таксама арганізацыю вольнага часу. Кадры культуры забяспечваюць адаптацыю асобы ў сістэме сацыяльных камунікацый; развіццё паслядоўных працэсаў сацыялізацыі, інкультурацыі і індывідуалізацыі; адукацыю асобы праз пастаяннае набыццё новых ведаў, уменняў і навыкаў; укараненне эстэтычных пачаткаў ва ўсе віды і формы жыццядзейнасці чалавека; уцягненне асобы ў працэс стварэння каштоўнасцей культуры, у розныя віды мастацкай, тэхнічнай, прыкладной і сацыяльнай творчасці, дзейнасці па ажыццяўленні сацыяльных праектаў; авалоданне тэхналогіямі захавання прыроднага і культурнага асяроддзя, каштоўнасцей сусветнай і айчыннай культуры, узораў і з'яў нацыянальнай традыцыйнай культуры; відовішчна-займальны і аздараўленчы адпачынак, псіхалагічную разрадку чалавека; фарміраванне дзелавых і міжасобасных адносін. Асновай дзейнасці кадраў з'яўляюцца *розныя віды прафесійнай кампетэнтнасці*: канцэптуальная, кантэкстуальная, тэхналагічная, камунікатыўная, інтэграцыйная. Дысертант адзначае, што кадравая супольнасць праяўляецца ў пэўнай сістэме, якая фарміруецца з паслядоўнасці элементаў: чалавечых і працоўных рэсурсаў, мастацка-творчых сіл людзей у складзе іх творчых задаткаў і здольнасцей, фізічнай, духоўнай і разумовай энергіі, накіраваных на культуратворчую дзейнасць.

У раздзеле **1.3 "Этапы станаўлення кадравай сістэмы культуры"** аўтар упершыню вызначае гістарычную перыядызацыю развіцця сацыякультурнай прафесійнай адукацыі і адначасовага станаўлення кадравай сістэмы сферы культуры Рэспублікі Беларусь. У гістарычнай рэтраспектыве краіны прапануецца вылучэнне наступных этапаў. **1918–1941** гг. – закладванне асноў інстытуцыялізацыі, упарадкавання грамадскіх сувязей і адносін у культуры ў адпаведнасці з канцэпцыяй партыйнасці культуры і падпарадкаванасці ўсёй яе сферы класавым інтарэсам; стварэнне адпаведнай структуры культурных інстытутаў, у тым ліку прафесійна-адукацыйных; развіццё кадравай складаючай праз адкрыццё сеткі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, першай вышэйшай установы ў сферы культуры – Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Фарміраванне розных тыпаў аб'ектаў культуры адбывалася з вызначэннем іх галоўнай функцыі – палітыка-выхаваўчай з апорай на камандна-бюракратычныя метады кіравання, часам прымусу і насілля над творчасцю і асобай. **1944–1975** гг. – інтэнсіўнае адраджэнне і ўдасканаленне культурна-асветніцкай сістэмы, разгортванне прафесійнага мастацтва, адукацыйнай падсістэмы культуры. Адкрыццё Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута, Мінскага інстытута культуры завяршыла стварэнне сістэмы вышэйшай адукацыі ў культуры. Развівалася структура сярэдняй спецыяльнай адукацыі сферы культуры ў абласцях, ажыццяўлялася масавае адкрыццё дзіцячых школ мастацтваў; сфарміравана сістэма кіравання галіной: у 1953 г. створаны Міністэрства культуры, а таксама адпаведныя органы тэрытарыяльнага кіравання культурай. Работа культурна-асветніцкіх устаноў прадугледжвала перш за ўсё



палітычную прапаганду, арганізацыю палітычнай самаадукацыі, навукова-асветніцкую дзейнасць, развіццё мастацкай самадзейнасці. З развянчаннем культу асобы культурная палітыка зрабіла паварот ад прынцыпаў прымусу да добраахвотнасці, свядомасці. **1976–1990** гг. – узмацненне цэнтраімклівых тэндэнцый аб'яднання ў прафесійныя кадравыя супольнасці культуры, інтэграцыя ўзаемазвязаных узроўняў адукацыі ў адзіную сістэму бесперапыннай прафесійнай адукацыі. У кантэксце сацыяльна-эканамічных рэформаў культурна-асветніцкая работа арганічна перарасла ў састаўную частку сацыяльна-культурнай дзейнасці; ставілася задача грамадскага эстэтычнага абслугоўвання людзей, актыўнага развіцця самадзейных формаў арганізацыі вольнага часу. Умоўны адлік пачатку фарміравання адзінай сістэмы бесперапыннай прафесійнай адукацыі ў галіне культуры правамерна звязаць з фактам перадачы ў 1988 г. у падпарадкаванне Міністэрству культуры вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў культуры. Былі закладзены адзіныя арганізацыйна-метадычныя асновы для ўдасканалення ўсіх узроўняў сістэмы прафесійных навучальных устаноў культуры, паглыблення іх творчых сувязей. Перыяд **1991–2009** гг. звязаны з прыняццем Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце краіны, набыццём палітычнай і эканамічнай незалежнасці. У прынятай у 2004 г. Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь – 2020 цэнтральным элементам адзінага збалансаванага комплексу "чалавек – навакольнае асяроддзе – эканоміка" пазначана культура як аснова для новай сістэмы маральна-духоўных, сацыяльна-этычных каштоўнасцей грамадства. Дзяржаўная палітыка ў сферы культуры скіроўваецца на стварэнне ўмоў развіцця і ўмацавання інфраструктуры галіны, забеспячэнне доступу грамадзян краіны да культурных даброт і інфармацыйных рэсурсаў, падтрымку навуковага асэнсавання культурных працэсаў. Прафесійная адукацыя ў сферы культуры набывае ключавую ролю ў забяспечэнні пераемнасці культурнага працэсу, выхаванні творчых асоб, здольных рухаць наперад культуру. Дысертант адзначае, што адбылося ўзмацненне і ўдасканаленне агульнадзяржаўных падыходаў да кадравага будаўніцтва, усталяванне цэласнай кадравай сістэмы галіны культуры як сукупнасці ўзаемазалежных складаючых: прафесійнай культуратворчай дзейнасці індывідуальных і калектыўных суб'ектаў, бесперапыннай прафесійнай адукацыі ў галіне культуры, здольнай поўнасцю забяспечваць патрэбнасці краіны спецыялістамі па ўсёй наменклатуры пасад, кіраўніцкай арганізацыйна-каардынуючай падсістэмы.

У раздзеле **1.4 "Дынаміка ўдасканалення кадравага складу галіны культуры"** на падставе статыстыкі з 1991 г. па 2008 г., вывучэння сацыякультурнай практыкі аўтар выяўляе станоўчую дынаміку кадравай састаўляючай культурнага працэсу, якая адлюстроўвае фарміраванне і ўдасканаленне "чалавечага капіталу", прызначанага ствараць культурныя каштоўнасці. Кадравая работа ў галіне культуры – аснова кіравання на ўсіх узроўнях: ад невялікай установы культуры да міністэрства, ад пошукаў талентаў з самага маленства да падтрымкі ў час навучання і раскрыцця творчага патэнцыялу, у станаўленні іх як прафесіяналаў, стварэння ўмоў для пастаяннага павышэння кваліфікацыі, набыцця дадатковых кваліфікацый. Да работнікаў культуры прад'яўляюцца універсальныя патрабаванні прафесійнай кампетэнтнасці, асобасна-маральных якасцей, умення наладжваць непасрэдныя кантакты з людзьмі. Спецыяліст культуры павінен добра разбірацца ў пытаннях гісторыі культуры, сучаснага культурнага жыцця, бягучай палітычнай сітуацыі. Прафесійна-адукацыйны ўзровень кадраў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

характарызуе гатоўнасць спецыялістаў да разнастайнай культурнай дзейнасці ў розных тыпах устаноў і ў адпаведных службовых катэгорыях. Кадры клубных устаноў складаюць амаль трэцюю частку працуючых у галіне культуры, расце іх колькасць з вышэйшай адукацыяй – каля 22%, аднак 30% клубных работнікаў не маюць спецыяльнай адукацыі. Шмат гадоў існавала недаразмеркаванне спецыялістаў у клубныя установы, і толькі апошнія два гады характарызуюцца станоўчымі зрухамі ў вырашэнні праблемы. Кадры бібліятэк – гэта пятая частка працуючых у галіне культуры; назіраецца скарачэнне агульнай колькасці пасад, аднак пры захаванні спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у тым ліку і з профільнай, іх прапорцыя ў агульнай колькасці спецыялістаў павялічылася з 38% амаль да 41%. Пашыраецца сетка музеяў і адпаведна павялічваецца колькасць спецыялістаў, сярод якіх да 65% з вышэйшай адукацыяй. Колькасць дзяржаўных тэатраў з 1990 г. стабільна павялічваецца, расце і колькасць мастацка-артыстычнага персаналу з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй – каля 85%. Кадры канцэртных устаноў таксама вызначаюцца ростам прафесійна-адукацыйнага ўзроўню: з 41% з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй у 1990 г. да цяперашніх 94% ад іх агульнай колькасці. У вышэйшых навучальных установах прафесарска-выкладчыцкі састаў мае выключна вышэйшую адукацыю. У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў і Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў амаль кожны трэці выкладчык мае званне прафесара ці дацэнта; у Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі – кожны другі, што вышэй, чым у сярэднім па сістэме Міністэрства адукацыі. У кадравым складзе сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў больш чым 85% спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй (лічбы 2008 г.). Аналіз дынамікі развіцця кадравых рэсурсаў культуры паказвае, што сістэма галіны сфарміравалася ў цеснай сувязі з развіццём прафесійнай адукацыі і з'явілася вынікам мэтанакіраванай культурнай палітыкі па насычэнні спецыялістамі вышэйшай кваліфікацыі ўстаноў культуры. Аднак устойлівае захаванне прыкладна трэці пасад спецыялістаў, занятых работнікамі без прафесійнай адукацыі ва ўстановах клубнага тыпу (самага масавага звяна сістэмы культуры), паказвае, што папаўненне ідзе ў асноўным на заняцце вакансій, якія ўзнікаюць з-за цякучасці кадраў, выкліканай у большай частцы часовай (двухгадовай) адпрацоўкай маладымі спецыялістамі па дзяржаўным размеркаванні. Неабходна ўдасканаленне практыкі замацавання маладых спецыялістаў – увядзенне ў якасці сацыяльнай падтрымкі ў сістэму дзяржаўнага размеркавання выпускнікоў абавязковага выдзялення службовага жылля ці прадастаўленне малапрацэнтнай пазыкі для будаўніцтва ўласнага жылля.

**У другой главе "Асаблівасці прафесійнай адукацыі ў сферы культуры"** аналізуецца разнастайнасць элементаў адукацыйнай сістэмы, мадэліруецца сістэма бесперапыннай адукацыі спецыялістаў культуры.

У раздзеле **2.1 "Бесперапыннасць адукацыі як аснова станаўлення і развіцця спецыялістаў культуры"** раскрываецца значнасць адукацыі як аднаго з найбольш важных сродкаў сацыяльнага ўзнаўлення грамадства, павышэння яго патэнцыялу і перспектыў сацыякультурнага развіцця. Паняцце "адукацыя" ўключае і сферу сацыякультурнай практыкі, і галіновую сістэму, і спецыяльна арганізуемы працэс, і вызначаны вынік дзейнасці. Думка аб карыснасці пастаяннага накаплення ведаў зарадзілася ў аддаленыя часы і ў тым ці іншым выглядзе сустракаецца ў навуковых працах многіх вучоных. Аднак сам феномен бесперапыннай адукацыі – здабытак XX



стагоддзя. Перарастанне ідэі "перманентнага" ажыццяўлення навучання чалавека (на працягу ўсяго працоўнага жыцця) у канцэпцыю пачалося ў першай палове мінулага стагоддзя і набыло навуковыя абрысы ў 1970–1980 гг. Гэтая канцэпцыя адпавядае і патрэбам грамадскага развіцця, і патрабаванням кожнага чалавека. Адукацыя разумеецца як бесперапынны працэс змянення, развіцця, удасканалення існуючай сістэмы ведаў на працягу ўсяго жыцця, бо толькі пастаянная падтрымка ўласнай кваліфікацыі і прафесійнага майстэрства можа дазволіць спецыялісту адчуваць сябе ўпэўнена і, у сваю чаргу, быць цікавым для іншых, асабліва ва ўмовах імклівай трансфармацыі сацыяльнага асяроддзя, перамен у сучаснай грамадскай практыцы. Бесперапыннасць адукацыі прадугледжвае пераемнасць і ўзаемнае дапаўненне фармальна рэгламентаванага навучання і нефармальнай ініцыятыўнай самаадукацыі, адзінства процілеглых пачаткаў – грамадскіх патрабаванняў да сацыялізацыі і прафесіяналізацыі і індывідуальных інтэрасаў, схільнасцей і здольнасцей людзей. У сістэме бесперапыннай адукацыі нараджаюцца ўсё новыя кірункі сацыякультурнай творчасці, якія замацоўваюцца, развіваюцца і ўзбагачаюць грамадства; рэалізуецца ідэя росту прафесійнага майстэрства спецыялістаў. Прафесійная адукацыя ў сферы культуры інтэгруе разнастайныя кірункі мастацка-творчай сацыялізацыі і прафесіяналізацыі на кожным этапе развіцця грамадства, яна падзяляецца на два блокі: *мастацкі*, у якім адбываецца замацаванне і развіццё схільнасці да творчай дзейнасці, выпрацоўка ўмення дзейнічаць у пэўным відзе мастацтва лёгка і прыгожа, і *культуралагічны*, які забяспечвае сацыяльна-неабходны ўзровень інтэлектуальнага і агульнакультурнага развіцця, набыццё прафесійных ведаў, уменяў і навыкаў для навуковага асэнсавання заканамернасцей творчага працэсу стварэння, засваення, захавання, распаўсюджвання і аднаўлення каштоўнасцей культуры, рэалізацыю эфектыўных культуратворчых тэхналогій. Важнае значэнне мае эстэтычная адукацыя, якая прызначана фарміраваць эстэтычны погляд дзяцей, падлеткаў, моладзі на сусвет, садзейнічаць тым самым гуманізацыі грамадства. Аднак прадметы мастацкага цыклу займаюць невялікую частку вучэбнага часу агульнаадукацыйнай школы, пераважае політэхнізацыя навучальнага працэсу, што вядзе да дэфіцыту ў выхаванні творчых пачаткаў, эстэтычнага адчування і вобразнага мыслення. Не выпраўляе становішча існаванне разгорнутай сеткі дзіцячых школ мастацтваў, якія даюць паглыбленыя веды ў розных відах мастацтва, аднак ахопліваюць толькі дзесятую частку дзяцей. Паўстае пытанне аб неабходнасці вучыць усіх дзяцей мастацтву без выключэння, бо толькі так магчыма дасягнуць мэты ў фарміраванні адукаванага, культурнага грамадства.

У раздзеле **2.2 "Сучасная сістэма падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі спецыялістаў культуры ў Беларусі"** прадстаўлена адукацыйная сістэма ў галіне культуры, якая мае ўстойлівыя звёны: школьнае, прафесійнае, паслядыпломнае. Гэта сістэма забяспечвае працэс сацыялізацыі чалавека, у выніку якой – падрыхтоўка кваліфікаваных кадраў праз набыццё і развіццё неабходных відаў культурнай дзейнасці, пазнання, тэхналогій, інструментарыя. Уся сістэма мае трывалыя ўзаемасувязі, і развіццё кожнага звяна служыць галоўнай мэце адукацыі ў сферы культуры – выхаванню прафесіяналаў для творчай дзейнасці ў культуры. Самае масавае пачатковае школьнае звяно ўключае дзіцячыя школы мастацтваў, якія з'яўляюцца, па сутнасці, адзіным інстытутам па выяўленні, захаванні і развіцці мастацкіх здольнасцей дзяцей, а таксама фарміраванню зыходных прафесійных навыкаў і прафесійнай арыентацыі ў культуры. Сярэднія



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спецыяльныя навучальныя ўстановы культуры задавальняюць масавыя запатрабаванні рэгіёнаў у спецыялістах сярэдняй кваліфікацыі. Развіццё і паглыбленне сістэмы навучання, своеасаблівая агранка здольнасцей, уменняў і навыкаў адбываюцца ў вышэйшых навучальных установах. Яны забяспечваюць спецыялістамі мастацкай творчасці, арганізацыі вольнага часу найболей значныя творчыя пасады ўстаноў культуры, а таксама рыхтуюць выкладчыцкія кадры. Падтрымку неабходнага ўзроўню прафесійнай кваліфікацыі спецыялістаў на працягу ўсёй працоўнай дзейнасці ў адпаведнасці з запатрабаваннямі часу ВНУ культуры забяспечваюць праз структуры паслядыпломнай адукацыі, якія садзейнічаюць прафесійнаму ўдасканаленню і самаразвіццю асобы, спрыяюць павышэнню кампетэнтнасці, прырашчэнню прафесійных якасцей, пашырэнню прафесійнага далягляду, засваенню новых тэхналогій. Прафесійная адукацыя прадстаўлена шырокім пералікам спецыялізацый, засваенне якіх адбываецца ў навучальных установах рознага галіновага падпарадкавання. Такая дыферэнцыяцыя прафесій у культуры з'яўляецца праявай усеагульнай тэндэнцыі паглыблення і дэталёвага засваення прафесійных тэхналогій ва ўсіх сферах чалавечай жыццядзейнасці. Вузкая спецыялізацыя дае вызначаныя перавагі ў якасным набыцці і развіцці прафесійных навыкаў, але адначасова спараджае праблему цэласнага ўспрымання аб'екта дзейнасці, упісвання ў сістэму яго ўзаемасувязей і ўзаемазалежнасцей. Пры даследаванні ўзаемасувязей адукацыйнага комплексу культуры выяўлена наяўнасць паралельных вучэбных кірункаў у ВНУ. Спецыяльнасці культуры прадстаўлены ў трох профільных установах, а таксама ў шэрагу класічных універсітэтаў і інстытутаў: Беларускім дзяржаўным універсітэце, Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М.Танка, Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П.Машэрава, Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я.Купалы, Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А.Куляшова, Дзяржаўным інстытуце кіравання і сацыяльна-тэхнічных навук, Інстытуце сучасных ведаў. Гэта азначае, што творчыя і навуковыя сілы, якія належаць да сферы культуры, раз'яднаны ў 10 установах вышэйшай адукацыі. Неабходна інтэграцыя мастацка-творчых і навуковых рэсурсаў, *стварэнне асацыяцыі прафесійнай адукацыі ў сферы культуры*, якая зможа аб'яднаць мастацка-творчыя, навуковыя, вучэбна-метадычныя рэсурсы. Такім чынам, з'явіцца магчымасць змястоўнага і сістэматычнага абмену вопытам педагагічнай работы, навукова-тэарэтычнага абагульнення культурнай дзейнасці ў нашай краіне; сістэма бесперапыннай адукацыі атрымае трывалы арганізацыйна-метадычны падмурак.

У раздзеле **2.3 "Тэхналагізацыя бесперапыннай прафесійнай адукацыі ў сферы культуры"** паказана значэнне розных тэхналогій у станаўленні індустрыяльнага грамадства і звязанай з гэтым працэсам канцэпцыі мадэрнізацыі, увядзенне і шырокае выкарыстанне паняцця "*тэхналогія сацыяльная*", вылучэнне тэхналогій у спецыяльную прадметную сферу культуры з падзелам на ствараемыя тыпы аб'ектаў: фізічныя; арганізацыі сацыяльнага ўзаемадзеяння; спараджэння і трансляцыі знакаў. Асноўную частку жыццёвага і тэарэтычна асэнсаванага практычнага вопыту сацыяльна-культурнай дзейнасці складаюць прафесіянальныя і аматарскія тэхналогіі. Гэтыя сацыяльна-культурныя, "неагуманітарныя" тэхналогіі вызначаюцца як сродкі абмену чалавечымі здольнасцямі і патрэбнасцямі ў сферы культуры. У сістэме спецыялізаваных тэхналогій асаблівае месца займае *сацыякультурнае праектаванне* як светапоглядная і тэхналагічная аснова шэрага прафесій сферы культуры. Яно дазваляе спецыялістам эфектыўна ажыццяўляць аналітычныя, арганізацыйна-кіраўніцкія і кансультацыйна-



метадычныя функцыі ў сферы культуры. Важнае значэнне набывае тэхналогія навучання з імкненнем да пераадольвання супярэчнасці паміж *асобасна-гуманістычнымі* і *культурна-тэхналагічнымі каштоўнасцямі.* У якасці аб'яднальнай мадэлі прымаецца дзейнасць чалавека ва ўзаемасувязі навыкаў, уменняў, тэхнічных прыёмаў і эстэтычнага ўспрымання, творчай фантазіі. Упарадкоўвае, сінхранізуе тэмпы развіцця ўсіх звёнаў сістэмы адукацыі, збалансоўвае механізм іх узаемадзеяння, замацоўвае спецыфічныя прафесійныя якасці навучэнцаў тэхналагізацыя бесперапыннай адукацыі. Паступальнае павышэнне прафесійнага ўзроўню, пашырэнне інфармацыйнага творчага поля дзейнасці, падтрымка і ўзбагачэнне "культурнай кампетэнтнасці" ўвасоблена ў аўтарскай *мадэлі* бесперапыннай адукацыі спецыялістаў культуры (гл. мал.1), якая адлюстроўвае адукацыйную рэальнасць. Вызначаны асаблівасці адукацыі: *пабудаванасць усёй сістэмы навучання на эмацыянальна-псіхалагічным асваенні свету і развіцці творчых задаткаў,* заахвочванні непасрэднай мастацкай практыкі (складаныя дыдактычныя механізмы і рацыянальны аналіз як аснова прыродазнаўча-матэматычнага кірунку адукацыі для сацыякультурнага кірунку з'яўляюцца дапаможным элементам); *неабходнасць ранняга адбору дзяцей* на падставе выяўлення іх прыродных здольнасцей, што тлумачыцца больш паспяховай дзіцячай успрымальнасцю і псіхафізіялагічнай прыстасаванасцю да пэўных спецыяльнасцей культуры; *спалучэнне бесперапыннасці адукацыі з яе тэхналагізацыяй* у сферы культуры, заснаваных на паслядоўнасці і пераемнасці канкрэтных тэхналогій на ўсіх узроўнях адукацыі, на індывідуалізаваных тэхналагічных лініях навучання з улікам актыўнасці, індывідуальных асаблівасцей студэнтаў, інтарэсаў, схільнасцей, запатрабаванняў, матываў, паглыбленні прафесійнай функцыянальнай граматнасці; *развіццё здольнасцей асэнсавання заканамернасцей культуратворчасці*, генезісу з'яў сусветнай і айчыннай культуры; *набыццё арганізацыйных уменняў* у рэалізацыі духоўна-эўрыстычных, інтэлектуальных, мастацка-творчых патэнцый людзей, праяўленняў іх сацыяльна-культурнай актыўнасці, асваенне механізмаў фарміравання спрыяльнага культурнага асяроддзя.

Такім чынам, бесперапыннасць прафесійнай адукацыі спецыялістаў культуры адпавядае няспыннасці культурнага працэсу і ажыццяўляецца праз адукацыйную сістэму ў сферы культуры. Гэты важнейшы сацыяльны інстытут здзяйсняе напраўленую форму сацыялізацыі, прафесійнае станаўленне і ўдасканаленне спецыялістаў, забяспечвае папаўненне грамадства творчымі кадрамі, здольнымі быць стваральнікамі, інтэрпрэтатарамі і арганізатарамі культуры, а таксама актыўна ўплывае на сацыяльнае асяроддзе, развіццё духоўнага свету асобы.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Функцыянаванне кадраў культуры адбываецца ў сферы культуры як складанай сістэме арганізацый і ўстаноў, якія ў працэсе грамадскага ўзнаўлення забяспечваюць існаванне мастацкай культуры (народнай і прафесійнай), ствараюць каштоўнасці культуры і далучаюць да іх насельніцтва. Кадры культуры – калектыўны суб'ект культурнай дзейнасці, устойлівае сацыяльна-прафесійнае аб'яднанне людзей на функцыянальна-дзейнаснай аснове са спецыялізацыямі паводле профіляў адукацыі "педагогіка", "мастацтва і дызайн", "гуманітарныя навукі", "камунікацыі". Прафесійная супольнасць індывідаў паўстае як выразнік калектыўнай памяці, свядомасці і мыслення, калектыўных норм, каштоўнасцей і ўяўленняў, і забяспечвае кансалідацыю,



РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

рэгуляцыю, камунікацыю і ўзнаўленне індывідуальных суб'ектаў. Кадры культуры характарызуе сацыяльная ідэнтычнасць – пачуццё прыналежнасці да прафесійнай групы і яднанне з ёй, узаемазвязанасць і ўзаемазалежнасць індывідаў. Структурнымі састаўляючымі кадраў культуры з'яўляюцца *творцы* – стваральнікі і інтэрпрэтатары каштоўнасцей культуры і *арганізатары* культурнага працэсу, паслуг у сферы вольнага часу. Сістэма сацыяльна-прафесійнай супольнасці індывідаў заснавана на паслядоўнасці элементаў, іх якаснай іерархіі: чалавечых і працоўных рэсурсаў культуры – наяўных і патэнцыяльных вытворцаў каштоўнасцей культуры; мастацка-творчых сіл – сукупнасці фізічнай, духоўнай і разумовай энергіі чалавека, скіраванай на вытворчасць і распаўсюджванне каштоўнасцей культуры; мастацка-творчых спецыялістаў з прафесійнай падрыхтоўкай і вопытам работы ў культуры [3; 12; 19; 20; 21].

2. Ажыццяўленне арганізацыі і запаўнення сферы вольнага часу шматлікімі відамі і формамі сацыяльна-культурнай дзейнасці на прафесійнай і аматарскай аснове патрабуе павышанага ўзроўню кваліфікаванасці і кампетэнтнасці спецыялістаў. Дзяржава мэтанакіравана забяспечвае развіццё сацыякультурнай прафесійнай адукацыі, у гістарычнай дынаміцы якой выяўлены пэўныя этапы: 1) закладванне асноў інстытуцыялізацыі, фармалізацыі грамадскіх сувязей і адносін у культуры, стварэнне структуры культурных інстытутаў, у тым ліку прафесійна-адукацыйных, фарміраванне кадравага патэнцыялу (1918–1941гг.); 2) фарміраванне сістэмы кіравання галіной культуры, удасканаленне культурна-асветнай работы, разгортванне прафесійнага мастацтва, развіццё адукацыйнай падсістэмы культуры як крыніцы папаўнення кадравых рэсурсаў (1944–1975гг.); 3) аб'яднанне ў адзіную сістэму прафесійнай адукацыі ўзаемазвязаных яе ўзроўняў, стварэнне агульных арганізацыйна-метадычных асноў удасканалення творчых сувязей навучальных устаноў культуры (1976–1990гг.); 4) пераўтварэнне сукупнасці ўзаемазалежных складаючых: прафесійнай культуратворчай дзейнасці індывідуальных і калектыўных суб'ектаў, бесперапыннай прафесійнай адукацыі ў галіне культуры (здольнай поўнасцю забяспечваць патрэбнасці краіны спецыялістамі), кіраўніцкай арганізацыйна-каардынуючай падсістэмы ў цэласную кадравую сістэму галіны культуры (1991–2009гг.). Кадравая сістэма забяспечвае захаванне культурнай прасторы краіны, з'яўляецца крыніцай якасных зрухаў у развіцці культуры, дае колькаснае і якаснае прырашчэнне культурнага і адукацыйнага патэнцыялу грамадства [2; 4; 8; 15; 22].

3. Дынаміка кадравых рэсурсаў культуры выяўляе, што станаўленне кадравай сістэмы галіны культуры адбылося ў цеснай сувязі з развіццём прафесійнай адукацыі ў культуры, з'явілася вынікам мэтанакіраванай культурнай палітыкі. Удасканаленне кадравага складу арганізацый культуры, яго якасная прафесійна-адукацыйная аснова праяўляецца ў прыросце ва ўстановах культуры спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Якасным паказчыкам з'яўляецца таксама пашырэнне наменклатуры спецыяльнасцей у культуры, што звязана з дыферэнцыяцыяй профіляў культурнай дзейнасці. Кадры *інстытута сацыякультурнай работы з насельніцтвам* ажыццяўляюць культурна-асветніцкую і святочна-відовішчную дзейнасць, аматарскую творчасць, гульнёва-забаўляльныя зносіны, задавальняюць інфармацыйныя, культурныя, навуковыя патрэбнасці, захоўваюць культурную спадчыну і далучаюць да яе насельніцтва. Кадры гэтага кірунку складаюць дзве трэці працуючых у галіне культуры, сярод іх спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у клубах – 22%, бібліятэках – 40,5%,



музеях – 65%. Кадры *інстытута прафесійнай мастацкай творчасці* рыхтуюць, арганізоўваюць і праводзяць спектаклі, канцэрты, іншыя публічныя паказы. У тэатрах спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй каля 85%, у канцэртных установах – 94,7%. Кадры *інстытута адукацыі ў сферы культуры* забяспечваюць данясенне каштоўнасцей культуры ў грамадства праз навучанне дзяцей, моладзі, падрыхтоўку спецыялістаў. У вышэйшых навучальных установах прафесарска-выкладчыцкі састаў мае вышэйшую адукацыю, амаль кожны трэці выкладчык мае званне прафесара ці дацэнта; у сярэдніх спецыяльных навучальных установах спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй звыш 85%. Кадры *інстытута кіраўніцкага рэгулявання* забяспечваюць выкананне канстытуцыйных праў у культурным жыцці, свабоду мастацкай творчасці і карыстанне дасягненнямі культуры; распрацоўваюць дзяржаўныя праграмы развіцця і распаўсюджвання культуры на карысць інтарэсаў чалавека і грамадства. Сярод іх спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй да 98%. Лічбы паступовага прыросту колькасці спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у адносінах да агульнай колькасці працуючых ва ўстановах культуры даюць станоўчую дынаміку папаўнення кадравага складу (даныя 2008 г.). Аднак устойлівае захаванне прыкладна трэці пасад спецыялістаў, занятых работнікамі без прафесійнай адукацыі ва ўстановах клубнага тыпу (самага масавага звяна сістэмы культуры), паказвае, што папаўненне ідзе на заняцце вакансій, якія ўзнікаюць з-за цякучасці кадраў, выкліканай у большай частцы часовай (двухгадовай) адпрацоўкай маладымі спецыялістамі па дзяржаўным размеркаванні. Неабходна ўдасканаленне сацыяльнай падтрымкі маладых спецыялістаў – увядзенне ў сістэму дзяржаўнага размеркавання выпускнікоў выдзялення службовага жылля ці прадастаўленне малапрацэнтнай пазыкі для будаўніцтва ўласнага жылля [2; 5; 8; 18; 19].

4. Прафесійная адукацыя ў сферы культуры забяспечвае падрыхтоўку кваліфікаваных спецыялістаў для падтрымання функцыянавання ўстаноў культуры і іх далейшага развіцця, стварае ўмовы для авалодання рознымі відамі мастацтва, выхавання творчых асоб. У спецыялізаваных навучальных установах маладыя спецыялісты атрымоўваюць навыкі прадукцыйнай дзейнасці (у тым ліку творчай, інавацыйнай) у абранай сферы, засвойваюць сістэму "культурнай кампетэнтнасці". Паслядыпломная адукацыя ў сферы культуры – цэнтральнае звяно прафесійнага ўдасканалення, якое садзейнічае прафесійнаму росту і самаразвіццю асобы, засваенню новых тэхналогій. Актыўна развіваецца сістэма падрыхтоўкі навуковых і навукова-педагагічных кадраў вышэйшай кваліфікацыі для сферы культуры: адкрываюцца новыя спецыяльнасці, падтрымліваецца і развіваецца магістратура як першая ступень падрыхтоўкі маладых навуковых і творчых кадраў. З мэтай аператыўнага забеспячэння кадрамі навейшых кірункаў прафесійнай дзейнасці, вырашэння праблемы атрымання профільнай спецыяльнай адукацыі практыкамі, якія маюць пэўны вопыт работы, арганізавана перападрыхтоўка кадраў. Арыенцірамі ў падрыхтоўцы кваліфікаваных спецыялістаў служаць дзяржаўныя адукацыйныя стандарты, якія забяспечваюць павышэнне якасці навучання, ствараюць спрыяльныя ўмовы для развіцця асобы навучэнца, аптымізуюць прынцыпы кіравання адукацыйнымі працэсамі, дасягаюць цеснай інтэграцыі з міжнароднымі стандартамі ў сферы адукацыі і закладваюць асновы для аб'ектыўнай ацэнкі ўзроўню адукацыі і кваліфікацыі выпускнікоў. Арыентаванне на творчасць, самаразвіццё ў поўнай меры адказвае новаму дыдактычнаму кірунку: ад пераважна візуальнага навучання да сумесных пошукавых, дыялогавых зносін студэнта і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкладчыка. У выніку выпускнікі прафесійных навучальных устаноў галіны аказваюцца падрыхтаванымі да выканання прафесійных задач і ўпэўнена ўваходзяць у практыку культурнай дзейнасці. Стварэнне асацыяцыі навучальных устаноў культуры ў Рэспубліцы Беларусь дазволіць умацаваць творчыя і навукова-метадычныя рэсурсы адукацыі ў сферы культуры, удасканальваць стандарты і вучэбныя планы па выпускаючых спецыяльнасцях культуры з улікам іх асаблівасцей у агульнай сістэме адукацыі, наладзіць прагназаванне развіцця адукацыйных і навуковых кірункаў у сферы культуры, садзейнічаць міжнародным кантактам, абмену навуковым і творчым вопытам, абагульненню і распаўсюджванню інавацый у адукацыі [6; 11; 12; 14; 15; 17, 23].

5. Сістэма бесперапыннай прафесійнай адукацыі спецыялістаў культуры грунтуецца на эмацыянальна-псіхалагічным асваенні свету, развіцці інтэлекту і творчых задаткаў. У межах гэтай сістэмы адбываецца набыццё і развіццё ўмення выказаць сябе і навакольны мір словамі, музычнымі гукамі, рухамі, фарбамі праз адпрацаваную з апорай на прыродныя задаткі і здольнасці *тэхналагізацыю* працэсу навучання, што дазваляе ўпарадкаваць, сінхранізаваць тэмпы развіцця ўсіх звёнаў сістэмы адукацыі, збалансаваць механізм іх узаемадзеяння, удасканаліць крытэрыі адбору кадраў для прафесійнай дзейнасці, дае магчымасць замацаваць спецыфічныя прафесійныя якасці навучэнцаў. Таленавітая моладзь набывае навыкі прадуктыўнай культурнай дзейнасці, атрымоўвае прафесію і далей у любым узросце можа адточваць сваё майстэрства, засвойваць новыя тэхналогіі, імкнуцца да наваўвядзенняў. Гэта адлюстроўваецца ў мадэлі бесперапыннай адукацыі спецыялістаў культуры праз адметныя ўзроўні навучання, якія ажыццяўляюцца ў адпаведных тыпах навучальных устаноў і праз самаадукацыю: прафесійна-арыентацыйны – ранні прафесійны адбор моладзі на падставе выяўлення іх прыродных здольнасцей і схільнасцей, паглыбленае прафесійнае арыентаванне ў культуры, прафесійны сярэдні – развіццё прыродных задаткаў і творчых праяў асобы, забяспячэнне бесперапыннасці паслядоўнасці прырашчэння прафесійных ведаў, уменняў, навыкаў; набыццё першай кваліфікацыі, прафесійны вышэйшы – фарміраванне і развіццё акадэмічнай, прафесійнай, сацыяльна-асобаснай кампетэнцый для рашэння задач у сферы прафесійнай культурнай дзейнасці, прафесійная самаідэнтыфікацыя; набыццё арганізацыйных уменняў у рэалізацыі духоўна-эўрыстычных, інтэлектуальных, мастацка-творчых патэнцый людзей, праяўленняў іх сацыяльна-культурнай актыўнасці, майстэрства і самасцвярджэння – удасканаленне культуратворчых тэхналогій, пастаяннае пашырэнне навуковага і творчага кругазора, здабыванне сацыяльнай і прафесійнай сталасці. На кожным адукацыйным узроўні мадэлі раскрыты *мэтавыя арыенціры* паслядоўнага разгортвання і ўскладнення працэсу навучання, паказана, што сістэма прафесійнай адукацыі сферы культуры аб'ядноўвае ў адзіным комплексе *асобасна-гуманістычныя каштоўнасці* (плюралізм, індывідуальнасць, самадэтэрмінацыю, зменлівасць, нелінейнасць) і *каштоўнасці культурна-тэхналагічныя* (адказнасць, адзінства ў дзеяннях, устойлівасць і ўзнаўляльнасць практыкі, валоданне культурнымі нормамі, адзіным полем ідэнтыфікацыі і ўніверсальнага дзяржаўнага адукацыйнага стандарта). Мэта пабудовы мадэлі заключалася ў стварэнні *падабенства* сістэмы-арыгінала, выяўленні яе параметраў у руху да *дасягнення сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці, прадуктыўнага самаразвіцця асобы ў сферы культуратворчай практыкі* [1; 10; 16; 22].






Малюнак 1 – Графааналітычная мадэль бесперапыннай прафесійнай адукацыі



БІБЛІЯТЭКА

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні рэзультатаў**

Імклівае развіццё культурных працэсаў у грамадстве патрабуе ўвагі да зменлівага культурнага асяроддзя і яго аналізу, выяўлення і пераадолення перашкод далейшага руху, удасканалення кадравай стратэгіі ў галіне культуры. Вынікі дысертацыйнага даследавання (характарыстыкі прафесійнай супольнасці сферы культуры; вызначэнне перыядызацыі развіцця сацыякультурнай прафесійнай адукацыі і адначасовага станаўлення кадравай сістэмы культуры; аналіз дынамікі змяненняў прафесійна-адукацыйнага ўзроўню спецыялістаў; выяўленне зместу адукацыйнага комплексу галіны культуры і паказ яго адметных уласцівасцей у тэарэтычнай мадэлі) маюць практычную каштоўнасць і могуць выкарыстоўвацца для правядзення неабходных змяненняў у рабоце з кадрамі, у навукова-даследчай дзейнасці, для ўдасканалення структуры бесперапыннай адукацыі ў сферы культуры, у практыцы выкладання ў ССНУ і ВНУ, аспірантуры, у сістэме павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў культуры. З улікам праведзенага даследавання магчыма даць некаторыя рэкамендацыі:

– распрацаваць функцыянальныя мадэлі рознатыповых устаноў культуры, на гэтай падставе ўвесці ў тыпавыя штаты пасады, адпаведныя сучасным напрамкам культурнай дзейнасці, скарэкціраваць змест вучэбна-вытворчай практыкі;

– удакладніць дзяржаўныя стандарты адукацыі па спецыяльнасцях культуры, пералік і аб'ёмы вучэбных прадметаў з улікам спецыфікі галіны; наблізіць метады навучання да задач прафесійнай дзейнасці ў культуры;

– стварыць асацыяцыю навучальных устаноў культуры для ўзмацнення іх навукова-творчага патэнцыялу, аб'яднання ініцыятыў, скіраваных на культурны прагрэс, распрацоўку і ўкараненне новых тэхналогій у культурную дзейнасць;

– удасканаліць сістэму павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі спецыялістаў культуры з улікам індывідуальных запатрабаванняў, тыпалагічнага мноства ўстаноў культуры, узмацніць кансультацыйную функцыю, максімальна выкарыстоўваць актыўныя формы навучання і абмену вопытам работы;

– увесці ў якасці сацыяльнай падтрымкі ў сістэму дзяржаўнага размеркавання маладых спецыялістаў, накіраваных у раённыя і сельскія ўстановы культуры, абавязковае выдзяленне службовага жылля ці прадастаўленне малапрацэнтных пазык для будаўніцтва ўласнага жылля.

Матэрыялы дысертацыі апрабіраваны пры вядзенні вучэбных прадметаў "Рэсурсная база сацыякультурнай дзейнасці", "Гаспадарчае ўтрыманне ўстаноў культуры" і "Менеджмент у сферы культуры" (раздзел "Кадравы патэнцыял арганізацый культуры"), таксама выкарыстаны ў праграме "Гісторыя мастацкай адукацыі. Культуралагічны аспект" для ФПК кіруючых работнікаў і спецыялістаў культуры і ў вучэбных праграмах "Асновы менеджменту" і "Рэсурсная база сацыяльна-культурнай дзейнасці" для спецыялізацыі "менеджмент сацыяльнай і культурнай сферы" (два акты аб укараненні ад 25 мая 2006 г.).



## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ СУІСКАЛЬНІКА


**Артыкулы ў навуковых рэцэнзаваных часопісах**

1. Сцепанцоў, А.І. Сістэма бесперапыннай адукацыі ў галіне культуры / А.І.Сцепанцоў // Мастацкая адукацыя і культура.– 2004. – №3 – С. 13–19.

2. Сцепанцоў, А.І. Праграмна-мэтавы падыход да рашэння кадравых праблем галіны культуры / А.І. Сцепанцоў // Веснік Бел. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2005.– №4. – С. 89–92.

3. Сцепанцоў, А.І. Кадры культуры як суб'ект сацыякультурнага ўзнаўлення грамадства / А.І. Сцепанцоў // Веснік Бел. дзярж. ін-та праблем культуры.– 2005.– №1(3–4).– С.18–21.

4. Сцепанцоў, А.І. Гістарычныя вехі станаўлення кадравай сістэмы культуры / А.І.Сцепанцоў // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки.– 2008.– №7.– С.129–132.

5. Сцепанцоў, А.І. Дынаміка кадраў культуры Рэспублікі Беларусь: 1991–2006 гг. / А.І. Сцепанцоў // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2008. – №3. – С.69–75.

6. Сцепанцоў, А.І. Асацыяцыя ВНУ культуры: інтэграцыя мастацка-творчых і навуковых рэсурсаў / А.І. Сцепанцоў // Веснік Бел. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2009.– №2. – С. 93–98.

**Артыкулы ў навуковых зборніках**

7. Степанцов, А. И. Образование в сфере искусств и социокультурный контекст / А.И. Степанцов // Диалог культур и культурная политика: сб. статей / Междунар. центр культуры, искусства и коммуникаций; редкол.: Л.А. Бажанов [и др.]; сост. И.Н. Духан.– Минск, 1998.– С. 211–219.

8. Степанцов, А.И. О положении с кадрами в отрасли культуры / А.И. Степанцов // Информ. бюллетень Администрации Президента Республики Беларусь.– 2002.– №10.– С.77–88.

9. Степанцов, А.И. К вопросу о значимости кадров культуры в углублении этнонациональных контактов / А.И.Степанцов // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: сб.науч.ст. / ГрГУ им. Я.Купалы; редкол.: М.А.Можейко (отв.ред.) [и др.].– Гродно: ГрГУ, 2008.– С.125–129.

10. Сцепанцоў, А.І. Кадры – творцы мастацкай культуры /А.І. Сцепанцоў // Культура Беларусі: стан і перспектывы развіцця: зб. артыкулаў / пад рэд. Я.Д. Грыгаровіч, П.Р. Ігнатовіча.– Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры, 2001.– С. 70–76.

11. Сцепанцоў, А.І. Мастацкая адукацыя і навука / М.І. Казловіч, А.І. Сцепанцоў // Беларуская культура сёння. Гадавы агляд – 2002: навук.-аналіт. выданне / Бел. дзярж. ін-т праблем культуры.– Мінск, 2003.– С. 70–82.

12. Сцепанцоў, А.І. Дзяржаўная падтрымка таленавітай моладзі / А.І. Сцепанцоў // Беларуская культура сёння. Гадавы агляд – 2003: навук.-аналіт. выданне / Бел. дзярж. ін-т праблем культуры.– Мінск, 2004.– С. 79–84.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

13. Степанцов, А.И. Воспитание детей и молодежи средствами искусства / А.И.Степанцов // Личность ребенка: развитие творческих способностей и формирование культуры мира: материалы науч.-практ. конф. / Респ. пионерский лагерь "Зубренок", 26–28 мая 1998 г.; под ред. В.Т. Кабуша; Бел. фонд социальной поддержки детей и




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

подростков, Госкомитет по делам молодежи Респ. Беларусь, Минобразования Респ. Беларусь, Академия последипломного образования.– Минск, 1998.– С. 100–106.

14. Сцепанцоў, А.І. Адукацыя ў сферы культуры і сацыякультурны кантэкст / А.І. Сцепанцоў // Культуралагічная падрыхтоўка студэнтаў у сістэме ВНУ: даклады, прачытаныя на навук.-метад. канф., г.Мінск, 4 – 5 лют. 1997 г. / рэдкал.: А.І. Смолік (адк.рэд.) [і інш.]. – Мінск: Бел. ун-т культуры, 1998.– С. 50–57.

15. Сцепанцоў, А.І. Асноўныя тэндэнцыі развіцця вышэйшай культуралагічнай і мастацкай адукацыі канца XX ст. / А.І. Сцепанцоў // Стандарты вышэйшай культуралагічнай і мастацкай адукацыі: тэарэтыка-метадалагічныя аспекты: матэрыялы навук.-метад. канф., г.Мінск, 2–3 лют. 1999 г. / рэдкал.: А.І. Смолік (адк.рэд.) [і інш.].– Мінск: Бел. ун-т культуры, 1999.– С. 172–177.

16. Сцепанцоў, А.І. Творчая дзейнасць у сістэме мастацкай адукацыі / А.І. Сцепанцоў // Практыка як састаўная частка прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў для сацыякультурнай сферы: матэрыялы навук.-метад. канф., г.Мінск, 1–2 лют. 2000 г. / рэдкал.: А.І. Смолік (адк.рэд.) [і інш.].– Мінск: Бел. ун-т культуры, 2000.– С. 172–178.

17. Сцепанцоў, А.І. Мастацкая адукацыя і рынак / А.І. Сцепанцоў // Чалавек. Культура. Рынак: матэрыялы Міжнар. навук. канф., г.Мінск, 10–11 крас. 2000 г. / адк. рэд. Л.І. Ракавецкая.– Мінск: Бел. дзярж. ін-т праблем культуры, 2000.– С.29–34.

18. Сцепанцоў, А.І. Мастацкая адукацыя як працэс сацыякультурнай камунікацыі /А.І. Сцепанцоў // Чалавек. Культура. Інфарматыка: матэрыялы навук.-практ. канф., г.Мінск, 7–8 снеж. 1999 г. / адк. рэд. Л.І. Ракавецкая.– Мінск: Бел. дзярж. ін-т праблем культуры, 2003. – С. 5–7.

19. Сцепанцоў, А. І. Сацыякультурная сутнасць падрыхтоўкі кадраў / А. І. Сцепанцоў // Дзяржава і творчая асоба: роля творчай інтэлігенцыі ў фарміраванні ідэалогіі беларускай дзяржавы: матэрыялы рэсп. навук.-тэарэт. канф., г.Мінск, 15 крас. 2004 г. / рэдкал.: Р.Б. Смольскі (старшыня) [і інш.]. – Мінск: БДА мастацтваў, 2004. – С. 67–75.

20. Сцепанцоў, А.І. Калектыўны суб’ект мастацкай культуры / А.І. Сцепанцоў // Сучасны гісторыка-культурны працэс: самавызначэнне і самарэалізацыя суб’екта: матэрыялы Рэсп. навук. канф., г.Мінск, 16–17 мая 2006г. / рэдкал.: С.В. Снапкоўская [і інш.]; адк. рэд. А.У. Рагуля. – Мінск: Бел.дзярж.пед.ун-т, 2006. – С.84–89.

21. Степанцов, А.И. Субъект художественной культуры: историческая динамика / А.И.Степанцов // XII Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 24-26 мая 2006 г.): матэрыялы чытанняў / рэдкал: М.А.Бяспалая (адк.рэд.) [і інш.]. – Мінск: Бел.дзярж.ун-т культуры і мастацтваў, 2007. – С.126–134.

22. Сцепанцоў, А.І. Кадравая сістэма галіны культуры ў развіцці / А.І. Сцепанцоў // Культура. Наука. Творчество: материалы Междунар. науч.-практ. конф., 19-20 апр. 2007 г.– Мінск: Бел.гос.акад. искусств, 2008. – С.96–100.

23. Степанцов, А.И. Повышение эффективности управляемой самостоятельной работы студентов / А.И.Степанцов // Шляхі павышэння эфектыўнасці кіруемай самастойнай работы студэнтаў: матэрыялы навук.-метад. канф., 14 лют. 2008 г. / рэдкал.: Р.А.Ровіна (адк.рэд). – Мінск: БДУ культуры і мастацтваў, 2009. – С. 189–192.





## РЭЗЮМЭ

**Сцепанцоў Аляксандр Іванавіч**

**Бесперапынная адукацыя спецыялістаў у сферы культуры (на матэрыяле Рэспублікі Беларусь)**

**Ключавыя словы:** сацыякультурнае ўзнаўленне, суб’екты культурнай дзейнасці, калектыўны суб'ект, кадры культуры, сацыякультурная адукацыя, культурная кампетэнтнасць, мадэль бесперапыннай прафесійнай адукацыі спецыялістаў культуры.

**Мэта даследавання:** паказаць сутнасць бесперапыннай прафесійнай адукацыі спецыялістаў культуры як сістэмы трансляцыі спецыялізаваных ведаў, фарміравання прафесійна-кваліфікацыйнага складу кадраў.

**Метады даследавання:** структурна-функцыянальны, сістэмна-гістарычны, гістарычна-параўнальны, аналіз статыстычных даных, тэарэтычнае мадэліраванне.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна**: удакладнены змест паняцця “кадры культуры”, вызначаны прыметы прафесійнай супольнасці; дадзена гістарычная перыядызацыя развіцця сацыякультурнай прафесійнай адукацыі; выяўлена дынаміка кадравага складу розных тыпаў арганізацый культуры; прапанавана аўтарская мадэль бесперапыннай прафесійнай адукацыі спецыялістаў культуры.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні:** вынікі даследавання пашыраюць праблемнае поле вывучэння кадраў культуры як асноўнай састаўляючай рэсурснай базы сацыякультурнай дзейнасці і даюць навуковыя асновы для працягу далейшага вывучэння заканамернасцей прафесійнага станаўлення спецыялістаў культуры, іх культурна-творчых характарыстык, зместу і вынікаў сацыяльна-культурнай дзейнасці; прапанаваны магчымыя кірункі ўмацавання творчых і навукова-метадычных рэсурсаў адукацыі ў сферы культуры. Матэрыялы даследавання могуць шырока выкарыстоўвацца ў навучальным працэсе Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў у рамках курсаў “Рэсурсная база сацыякультурнай дзейнасці”, “Гаспадарчае ўтрыманне ўстаноў культуры”, “Менеджмент у сферы культуры”.

**Сферы ўжывання:** прыкладная культуралогія, гісторыя і тэхналогія сацыякультурнай дзейнасці, тэорыя кіравання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**РЕЗЮМЕ**

**Степанцов Александр Иванович**

**Непрерывное образование специалистов в сфере культуры (на материале Республики Беларусь)**

**Ключевые слова:** социокультурное воспроизводство, субъекты культурной деятельности, коллективный субъект, кадры культуры, социокультурное образование, культурная компетентность, модель непрерывного профессионального образования специалистов культуры.

**Цель работы**: показать сущность непрерывного образования специалистов культуры как системы трансляции специализированных знаний, формирования профессионально-квалификационного состава кадров.

**Методы исследования:** структурно-функциональный, системно-исторический, историко-сравнительный, анализ статистических данных, теоретическое моделирование.

**Полученные результаты и их новизна**: уточнено содержание понятия “кадры культуры”, определены приметы профессиональной общности; дана историческая периодизация развития социокультурного профессионального образования; выявлена динамика кадрового состава разных типов организаций культуры; предложена авторская модель непрерывного профессионального образования специалистов культуры.

**Рекомендации по использованию:** итоги исследования расширяют проблемное поле изучения кадров культуры как основной составляющей ресурсной базы социокультурной деятельности и дают научные основания для продолжения дальнейшего изучения закономерностей профессионального становления специалистов культуры, их культурно-творческих характеристик, содержания и результатов социально-культурной деятельности.

Материалы исследования могут широко использоваться в учебном процессе Белорусского государственного университета культуры и искусств в рамках курсов "Ресурсная база социокультурной деятельности", "Хозяйственное содержание учреждений культуры", "Менеджмент в сфере культуры".

**Сферы использования:** прикладная культурология, история и технология социокультурной деятельности, теория управления.



**SUMMARY**

**Aleksandre I. Stepantsov**

**The lifelong education specialists in the sphere of culture (On the material of Belarus)**

**Keywords:** socio-cultural reproduction, subjects of cultural activity, collective subject, culture staff, socio-cultural education, cultural competence, model of lifelong education of specialists in the sphere of culture.

**The purpose of the research**: to open the essence of lifelong professional education of specialists in the sphere of culture which transmissions special knowledges, forming a professional qualified staff.

**Research methods:** structure-functional, system-historical, historic-comparative, the statistic analysis, theoretical modelling.

**The obtained results and their novelty**: the content of the concept “culture staff” is specified, signs of a professional community are defined; the historical timing of the development of the socio-cultural vocational training is given; the dynamics of the development of the staff structure in different types of culture institutions is discovered; the author's model of lifelong education of specialists in the sphere of culture is proposed.

**Practical recommendations:** research results expand the problem field of studying culture staff as the main constituent of the resource base in the socio-cultural activity and give scientific grounds for further studying the laws of professional formation of specialists in the sphere of culture, their cultural-creative characteristics, the content and results of socio-cultural activity. Research materials can be widely used in the educational process at Belarus State University of Culture and Arts in the courses "Resource base of socio-cultural activity", "Economic content of culture institutions", "Management in the sphere of culture ".

**The fields of application:** applied culturology, history and technology of socio-cultural activity, theory of management.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Навуковае выданне*

**Сцепанцоў Аляксандр Іванавіч**

**Бесперапынная адукацыя спецыялістаў у сферы культуры (на матэрыяле Рэспублікі Беларусь)**

**Аўтарэферат**

дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата культуралогіі
па спецыяльнасці 24.00.01 – тэорыя і гісторыя культуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падпісана ў друк 14.12. 2009 г. Фармат 60х84 1/16
Папера пісчая №2 Ум.друк.арк. 1,39 Ул.-выд.арк. 1,71
Тыраж 60 экз. Заказ № 364
УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"
220001, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17

Надрукавана на рызографе
УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"